CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



7. *Карский, Е.Ф.* Белорусы: в 3 т., 7 вып. / Е.Ф. Карский. – Варшава, 1903–1922. – Т. 2: Язык белорусского племени, [вып.] 1. Исторический очерк звуков белорусского наречия. – Варшава: Типогрфия Варшавского учебного округа, 1908. – [2], IV, XXIV, 579 с.
8. *Крип'якевич, І.П.* Білорусі / І.П. Крип'якевич. – у Львові: З друк. наук. тов-ва ім. Т. Шевченка під зарядом К. Беднарського, 1909. – 16 с.
9. *Ластоўскі, В.Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі: з 40 рысункамі / Власт. – Вільня: Друкарня М. Кухты, 1910. – IV, 104 с.: іл., партр., факсім.
10. *Пыпин, А.Н.* Белорусская этнография / А.Н. Пыпин // Вестник Европы. – 1887. – Кн. 4. – С. 644–686.
11. *Пыпин, А.Н.* Белорусская этнография / А.Н. Пыпин // Вестник Европы. – 1887. – Кн. 5. – С. 211–252.
12. *Пыпин, А.Н.* Белорусская этнография / А.Н. Пыпин // Вестник Европы. – 1887. – Кн. 6. – С. 640–681.
13. *Пыпин, А.Н.* Белорусская этнография / А.Н. Пыпин // Вестник Европы. – 1887. – Кн. 7. – С. 184–226.
14. *Сапунов, А.* Белоруссия и белорусы / А.П. Сапунов. – Витебск: Губернская типография, 1910. – 21 с.
15. *Янчук, Н.А.* По Минской губернии: заметки из поездки в 1886 г. / Н.А. Янчук. – М.: Тип. А. Левинсон и К, 1889. – 130, 10 с.

SUMMARY

*The article describes historiographical studies of pre-Soviet period in the cultural history of Belarus from late 18th to the first half of 19th century.*

*The author distinquishes the works of Russian scientists (P.A. Giltenbrandt, P.A. Bessonov, A.N. Pypin and P.A. Sapunova). The author also distinguishes the works of Belarusian scientists (A.G. Kirkor, N.A. Yanchuk, A.K. Elskiy, E.F. Karskiy and V.Y. Lastovskiy). The author places emphasis on the works of Ukrainian scientists (D.I. Doroshenko and I.P. Kripyakevich) which also deny the Polish and Russian concept and agree with the research of Belarusian scientists, who treated Belarusians as a separate ethnic group with its own culture that emerged from its own historical roots and developed in its unique ways.*

Поступила в редакцию 01.10.2014 г.

*УДК 94(438)«192»:323.1–053.81*

***В.І. Крывуць,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БарДУ*

# ЛАГЕР НАЦЫЯНАЛЬНАГА АБ'ЯДНАННЯ І РАЗВІЦЦЁ ПРАЎРАДАВАГА МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ 2-й РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 30-х гг. XX ст.

Рэпазіторый БДПУ

Праблема развіцця і дзейнасці праўрадавага маладзёжнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд працягвае захоўваць актуальнасць, паколькі яна не знайшла комплекснага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Трэба адзначыць, што ў савецкія часы ў асноўным вывучалася гісторыя камсамола Заходняй Беларусі і яго барацьба за ўплыў на мясцовую моладзь [1]. Праўрадавыя маладзёжныя саюзы ўпаміналіся толькі ў кантэксце гэтай барацьбы. Сёння пачалі з'яўляцца публікацыі, у якіх разглядаецца дзейнасць некаторых польскіх маладзёжных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд, калі яна знаходзілася пад польскай акупацыяй [2]. Аднак асноўная ўвага надаецца найбольш вядомым аб'яднанням – Стралецкаму саюзу, Легіёну маладых, Саюзу сельскай моладзі. Па-ранейшаму застаецца малавывучанай дзейнасць арганізацый, створаных у другой палове 1930-х гг. і звязаных з правым крылом «санацыі», Лагерам нацыянальнаго аб'яднання (ЛНА).

*Мэта даследавання* – асвятленне ідэйнай эвалюцыі «санацыйнага» рэжыму ў другой палове 1930-х гг. і яе ўплыў на развіццё праўрадавага маладзёжнага руху 2-й Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ў той час знаходзілася ў складзе міжваеннай польскай дзяржавы.

Неабходна адзначыць, што пасля смерці Ю. Пілсудскага ў 1935 г. «санацыйны» лагер захаваў сваю ўладу, але ўнутры яго адбылася так званая «дэкампазіцыя», што паўплывала і на ўрадавую маладзёжную палітыку. «Санацыя» раскалолася на тры групоўкі. Першая, «замкавая», аб'ядналася вакол прэзідэнта І. Масьціцкага і займала адносна памяркоўную пазіцыю. Другую ўзначаліў Генеральны інспектар узброеных сіл, генерал, у далейшым маршал Э. Рыдз-Сміглы. Яе прадстаўнікі выступалі за ўсталяванне больш аўтарытарнага рэжыму. Трэцяй групоўкай з'яўлялася «група палкоўнікаў» на чале з В. Славекам, лідарам Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам (ББСУ). Апошняя групоўка вельмі хутка была адхілена ад улады. Урад В. Славека пайшоў у адстаўку, а ББСУ быў распушчаны.

У «санацыйнай» ідэалогіі пасля 1935 г. адбыліся значныя і прынцыповыя змены. Сучасныя польскія даследчыкі адзначаюць, што ў 1926–1935 гг. пілсудчыкі аднагалосна заяўлялі аб неабходнасці падпарадкавання інтарэсаў нацыі інтарэсам дзяржавы. Абвяшчаўся тэзіс прымату дзяржавы над нацыяй. Лічыцца, што ў той перыяд пілсудчыкі абвяргалі нацыяналістычныя погляды, якія яны лічылі шкоднымі для інтарэсаў 2-й Рэчы Паспалітай. Такім чынам, на думку польскіх гісторыкаў, «санацыйныя» ідэолагі надавалі патрыятызму антынацыяналістыч-

ную формулу. У 1935–1939 гг. пілсудчыкі адкінулі тэзіс пра аднабаковае падпарадкаванне нацыі дзяржаве, прапаноўвалася іх «пазітыўная ўзаемазалежнасць». Яны змянілі само азначэнне нацыі. Калі раней яе разглядалі як палітычную супольнасць, то пасля 1935 г. нацыю лічылі ўжо этнічна-культурным аб'яднаннем. «Санацыйны» лагер пачаў выступаць за атаясамліванне дзяржаўных і нацыянальных інтарэсаў пры захаванні асобных сфер дзейнасці і мэт. За польскай нацыяй прызнавалася роля стваральніцы і абаронцы Рэчы Паспалітай. Таксама «санацыйнымі» ідэолагамі прызнавалася пазітыўнае значэнне для дзяржавы тых нацыяналістычных поглядаў, якія павышаюць яе бяспеку [3, с. 62].

Адначасова «санацыйны» лагер пачаў стварэнне новага блока замест распушчанага ББСУ. Наладжваліся сувязі з нацыяналістамі. Частка кіраўнікоў «санацыі» з групоўкі Э. Рыдз-Сміглага пачала адкрыта заяўляць аб неабходнасці ідэйнага сінтэзу абодвух лагераў і ўтварэння новай арганізацыі. 21 лютага 1937 г. палкоўнік А. Коц, адзін з бліжэйшых паплечнікаў Э. Рыдз-Сміглага, абвясціў пра стварэнне Лагера нацыянальнага аб'яднання (Oboz Zjednoczenia Narodowego, ЛНА). Ідэйна-палітычная дэкларацыя ЛНА абвяшчала нормай палітычнага жыцця, асновай ладу і парадку ў дзяржаве Канстытуцыю 1935 г.

Другім важнейшым элементам дзяржаўнага жыцця была абвешчана армія. Абарончая сіла дзяржавы, якая напрамую вынікала з добра арганізаванага і кіруемага ўнутранага жыцця з'яўлялася, на думку аўтараў дэкларацыі, найбольш кардынальнай ідэяй, вакол якой грамадства павінна аб'яднацца, забыўшыся на дэмаралізуючыя спрэчкі, асабістыя крыўды і старыя рахункі. Гэта гарантуе Айчыне спакойнае развіццё і ўпэўненасць у будучыні. Згодна з дэкларацыяй ЛНА і ў адпаведнасці з «санацыйнай» традыцыяй, дзяржава лічылася адзінай правільнай і здаровай формай існавання нацыі, менавіта яна дае нацыі «тэхніку моцы і арганізацыю вечнага развіцця». Новым момантам для «санацыйнага» лагера было тое, што дэкларацыя ўпершыню адкрыта і выразна абвяшчала пра цесную духоўную сувязь польскай нацыі з Каталіцкім Касцёлам і неабходнасць устанавіць над Касцёлам належную апеку [4, с. 9–11].

Вырашаць гаспадарчыя і грамадскія праблемы меркавалася зыходзячы з вядучай ідэі ЛНА – абарончай сілы і магутнасці дзяржавы. Захоўваючы прынцып прыватнай уласнасці, аўтары дэкларацыі настойвалі на тым, што дзяржава ўсё ж такі мае права ўмешвацца ў гаспадарчае жыццё. Пад асаблівы кантроль прапанавалася ўзяць тыя галіны прамысловасці, якія маюць непасрэднае дачыненне да абараназдольнасці краіны. Дзяржава павінна была лічыцца адзіным фактарам, які заклікаы рэгуляваць узаемныя адносіны паміж асобнымі пластамі грамадства [4, с. 12–14].

Дырэктывай у адносінах да нацыянальных меншасцей дэкларацыя ЛНА абвяшчала «брацкае грамадзянскае сужыццё на той зямлі, за якую на працягу стагоддзяў мы пралівалі кроў». Але ў адносінах да яўрэйскай нацыянальнай меншасці дэкларавалася асобная пазіцыя. З аднаго боку, асуджаліся гвалтоўныя антысеміцкія выступленні, але, з іншага боку, прызнаваліся зразумелымі «інстынкт культурнай самаабароны і імкненне польскага грамадства да гаспадарчай самастойнасці». Такім чынам, антысемітызм у эканамічнай і культурнай сферах лічыўся дапушчальным [4, с. 17–18].

Галоўны лозунг ЛНА быў «Моцныя, згуртаваныя, гатовыя». Ён заклікаў да пераадолення ўсіх ідэйна-палітычных наступстваў перад знешняй пагрозай [5, с. 59], у першую чаргу, паміж «санацыяй» і польскімі нацыяналістамі.

Новыя ідэалагічныя пастулаты адбіліся і на правядзенні афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Пры ЛНА была створана Служба маладых (Sluzba Mlodych, СМ). Яна павінна была стаць федэрацыяй праўрадавых маладзёжных саюзаў, якія, захоўваючы сваю арганізацыйную самастойнасць, стаялі на аснове ідэйнай дэкларацыі ЛНА [6, с. 201]. Трэба адзначыць, што ЛНА меў пэўныя праблемы з ужо існаваўшымі «санацыйнымі» маладзёжнымі арганізацыямі. Так, Стралецкі саюз «Стралец» спачатку падтрымаў абвяшчэнне дэкларацыі аб стварэнні Лагера нацыянальнага аб'яднання і выказаў сваю згоду ўступіць у яго састаў. Але ў далейшым ён так і не далучыўся да ЛНА. Легіён маладых наадварот уступіў у ЛНА, але потым пакінуў яго [6, с. 141]. Супраць ЛНА выступаў і Саюз маладой вёскі [6, с. 197]. Усе гэта было вынікам расколу «санацыі».

У выніку кіраўніцтва ЛНА ўзяло курс на стварэнне сваёй уласнай маладзёжнай арганізацыі. 22 чэрвеня 1937 г. выйшла спецыяльная дэкларацыя шэфа ЛНА, палкоўніка А. Коца аб стварэнні Саюза маладой Польшчы (Zwiazek Mlodej Polski, СМП), які павінен быў стаць чацвёртым маладзёжным сектарам ЛНА (акрамя гарадскога, вясковага і рабочага). З самага пачатку да яго стварэння мелі дачыненне прадстаўнікі крайне правай польскай нацыяналістычнай арганізацыі «Фаланга», якія на нейкі час нават перахапілі ў свае рукі фактычнае кіраўніцтва СМП [7, с. 114].

Уплыў польскіх нацыяналістаў знайшоў сваё адлюстраванне ў ідэйна-палітычнай дэкларацыі новай «санацыйнай» маладзёжнай арганізацыі. Было адкрыта заяўлена, што члены СМП

Рэпазіторый БДПУ

з'яўляюцца нацыяналістамі, паколькі іх асноўная мэта працы і барацьбы – гэта веліч польскай нацыі. Саюз маладой Польшчы павінен быў змагацца за «поўнае духоўнае аб'яднанне нацыі, мабілізацыю ўсіх яе творчых сіл, як гэта загадаў Вярхоўны Правадыр» (Вярхоўным Правадыром лічыўся лідар ЛНА, маршал Э. Рыдз-Смігла). Таксама абвяшчалася барацьба за «арганізацыю нацыі ў межах моцнага дзяржаўнага ладу, што дазволіла б вылучыць з яе максімум сіл для рэалізацыі гістарычнага прызначэння» [8, с. 296].

Дэкларацыя СМП лічыла неабходным ажыццяўленне вялікіх пераўтварэнняў у гаспадарча-грамадскай структуры згодна з адзіным дзяржаўным планам. Толькі такім чынам можна было рэалізаваць пастулат сацыяльнай справядлівасці [8, с. 296].

СМП прызнаваў культ асобы Э. Рыдз-Сміглага. Ідэолагі арганізацыі заяўлялі: «Мы не прызнаём тых ці іншых партыйных ці групавых бажкоў. Адзіным аўтарытэтам, якому мы цалкам падпарадкоўваемся, з'яўляецца Маршал Рыдз-Смігла. Мы лічым яго не толькі Правадыром Арміі, але і Правадыром Нацыі і ўсёй польскай моладзі. Ён загадаў аб'яднацца і мы самым цесным чынам супрацоўнічаем з гэтай акцыяй, нягледзячы на тыя ці іншыя перашкоды ці цяжкасці» [8, с. 297–298].

Структура аб'яднання абапіралася на строгую іерархію і дзялілася на секцыі (студэнцкую, вясковую і рабоча-рамесніцкую). Таксама пры СМП існавалі свае сілавыя структуры – «Ахоўныя дружыны», якія разам з польскімі нацыяналістамі ўдзельнічалі ў акцыях супраць левых арганізацый і эканамічным байкоце яўрэйскага насельніцтва [7, с. 115].

Трэба адзначыць, што СМП, не паспеўшы аформіцца, перажыў раскол. У пачатку 1938 г. змянілася кіраўніцтва ЛНА, замест палкоўніка А. Коца быў прызначаны генерал С. Скварчыньскі. Апошні выказаўся супраць супрацоўніцтва з «Фалангай», і яе прыхільнікі былі выключаны з арганізацыі. Менавіта, каб умацаваць свае ўплывы сярод моладзі, ЛНА абвясціў аб стварэнні Службы маладых. На чале СМ быў пастаўлены маёр Э. Галінат, які адначасова з'яўляўся і новым кіраўніком СМП. У склад СМ увайшлі рэшткі СМП і шэраг іншых невялікіх «санацыйных» маладзёжных саюзаў, а таксама Стралецкі саюз [9, с. 249].

Адзін з кіраўнікоў Службы маладых Я. Макоўскі заяўляў, што дадзеная арганізацыя з'яўляецца першай спробай вырашэння маладзёжнай праблемы. Для гэтага, на яго думку, неабходна было праводзіць акцыю аб'яднання намаганняў маладога пакалення на аснове агульнага светапогляду пераважнай большасці маладога пакалення (зразумела, што на ўвазе мелася ідэалогія ЛНА) у сферы канкрэтных спраў. На першы план гэтай акцыі павінны былі ставіцца выхаваўчыя мэты. Патрэбна было выхаваць перапаможны тып маладога паляка, які будзе мысліць нацыяналістычнымі і салдацкімі катэгорыямі, змагацца за веліч сваёй нацыі і дзяржавы, умець падпарадкоўвацца і дзейнічаць дысцыплінавана. Наступнай задачай акцыі было «задзейнічаць усе творчыя і актыўныя сілы маладога пакалення ў рытм дзяржаўнай працы» [10, с. 258–259].

У красавіку-маі 1938 г. у Варшаве адбыліся спецыяльныя курсы СМ, на якіх былі сфармуляваны асновы ідэйнай дактрыны арганізацыі. Галоўным прынцыпам была абвешчана служба Польшчы, паслядоўная і планавая праца ў імя дабра Польшчы. Для яе СМ і праводзіла «духоўную мабілізацыю маладога пакалення» [9, с. 249].

Асноўныя ідэйныя пастулаты, выказаныя на курсах СМ, супадалі з пастулатамі ідэйнай дэкларацыі ЛНА. Сацыяльныя праблемы, падпарадкаваныя прынцыпу абароны дзяржавы, павінны былі вырашацца на аснове сацыяльнай справядлівасці. Што датычыцца праблемы нацыянальных меншасцей, то «аўтахтонным» (славянскім) меншасцям прапаноўвалася далучэнне да польскай дзяржаўнай праграмы з адначасовым узмацненнем польскага нацыянальнага элемента на тэрыторыях са змешаным насельніцтвам. У адносінах да «яўрэйскага пытання» лічылася неабходным праводзіць планавую яўрэйскую эміграцыю разам з «паланізацыяй» культурнага і гаспадарчага жыцця, а таксама ізаляцыяй яўрэяў ад польскага насельніцтва [9, с. 252–253].

Лідары СМ і СМП неаднаразова выкладалі свае пастулаты адносна правядзення ўрадавай маладзёжнай палітыкі. Так, пасол сейма А. Мілеўскі, які адначасова з'яўляўся і кіраўніком СМП на тэрыторыі Палескага ваяводства, у сваёй прамове на парламенцкім пасяджэнні ў лютым 1939 г. заявіў, што праблемай сучаснага моманту з'яўляецца «абуджэнне веры ў нацыю, яе бессмяротныя каштоўнасці, яе гістарычную місію, абуджэнне актыўнай нацыяналістычнай і хрысціянскай пазіцыі». На яго думку, гэта патрабавала ўмяшальніцтва ва ўсе сферы дзяржаўнага жыцця і, у першую чаргу, у сферу пазашкольнай асветы. Пасол лічыў, што Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы не спраўляецца з гэтым. Такім чынам, маладзёжныя кіраўнікі ЛНА з'яўляліся яшчэ большымі паланізатарамі і нацыяналістамі, чым тагачаснае кіраўніцтва сістэмы адукацыі. Ацэньваючы сваю арганізацыю (СМП), пасол падкрэсліў, што яна прыдае нацыянальны характар гаспадарчаму, культурнаму і духоў-

Рэпазіторый БДПУ

наму жыццю, імкнецца да грамадскай працы і здаровых аграрных адносін [11, с. 8–9].

Варта адзначыць, што дзейнасць маладзёжнага крыла Лагера нацыянальнага аб'яднання на тэрыторыі Заходняй Беларусі была не вельмі паспяховай. Найбольшую актыўнасць Саюз маладой Польшчы і Служба маладых ЛНА выявілі на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. Як адзначаюць польскія даследчыкі, гарадскі сектар СМП «санацыі» давялося ствараць з самых асноў. У той жа час сельскі сектар СМП на Беласточчыне быў сфарміраваны за кошт Саюза народнай моладзі (СНМ). Гэта арганізацыя раней адмовілася ўвайсці ў склад створанага ўладамі Саюза маладой вёскі (СМВ). Фактычна менавіта на СНМ абапіраўся маладзёжны рух ЛНА. Пры гэтым працэс стварэння гурткоў і інстанцый СМП расцягнуўся ў часе і быў перарваны пачаткам Другой сусветнай вайны. Аднак да сярэдзіны 1939 г. СМП дзейнічаў на тэрыторыі ўсіх паветаў Беластоцкага ваяводства, за выключэннем Ваўкавыскага павета. Усяго ён налічваў каля 130 аддзелаў і 2 тыс. 500 членаў. Саюз не дасягнуў такога масавага характару як іншыя «санацыйныя» арганізацыі моладзі. Так, СМВ на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў той жа час налічваў каля 7 тыс. членаў [12, с. 86–87].

Філіялы СМП і СМ ствараліся і на іншых тэрыторыях Заходняй Беларусі. Вядома, што студэнцкае аддзяленне СМП было створана ў Віленскім універсітэце імя С. Баторыя. Але пра яго дзейнасць няма ніякіх даных. Віленскія студэнты ў той час з'яўляліся ў асноўным рашучымі прыхільнікамі праціўнікаў «санацыі» – польскіх нацыяналістаў. Так, калі ў маі 1937 г. маршал Э. Рыдз-Сміглы наведаў універсітэт, ён быў запрошаны на пасяджэнне карпарацыі «Палонія». На гэту сустрэчу запрасілі іншыя студэнцкія карпарацыі, аднак большасць з іх дэманстратыўна адмовілася сустракацца з праваднром Лагера нацыянальнага аб'яднання [13, с. 38].

Што датычыцца Палескага ваяводства, то афіцыйная справаздача аб дзейнасці ЛНА на Палессі ў 1938 г. паведамляла наступнае: «Служба маладых у справаздачны перыяд не змагла праявіць вялікай дзейнасці ў выніку ўзрушэнняў, выкліканых расколам у Саюзе маладой Польшчы, які з'яўляецца асноўнай арганізацыяй Службы маладых ЛНА». Як прызнавалася ў справаздачы, праца СМ у рэгіёне зводзілася да нерэгулярна арганізаваных курсаў у Брэсце і Дубоі, дзе члены СМП і блізкіх да яго маладзёжных аб'яднанняў праходзілі арганізацыйную і прафесійную падрыхтоўку. У пачатаку 1939 г. СМП на Палессі знаходзіўся ў стадыі рэарганізацыі [14, с. 4].

Такім чынам, маладзёжныя арганізацыі, якія знаходзіліся пад апекай Лагера нацыянальнага аб'яднання, не мелі ўплыву ў праўрадавым маладзёжным руху. Былі зроблены пэўныя крокі ў фармуляванні ідэалогіі Саюза маладой Польшчы і Службы маладых. Гэта ідэалогія цалкам супадала з ідэйнымі пастулатамі ЛНА. Аднак канчатковага арганізацыйнага афармлення вышэйназваных саюзаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі не адбылося. Гэта было звязана як з канфліктамі ўнутры «санацыі», так і з пачаткам Другой сусветнай вайны. У цэлым жа дзейнасць ЛНА па стварэнні сваіх маладзёжных філіялаў можна ацаніць як праяўленне пэўнага крызісу ўрадавай маладзёжнай палітыкі.

### Літаратура і крыніцы


1. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии 1921–1939 гг.) / А.Н. Мацко, Н.С. Орехво, Т.И. Притыцкая и др.; под ред. А.Н. Мацко и В.Е. Самутина. – Минск, 1966. – 401 с.
2. *Гецевич, А.К.* Польские молодежные организации в Новогрудском воеводстве (конец 20-х – начало 30-х гг. XX в.) / А.К. Гецевич, В.И. Кузьмич // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. Минск, 2012. – Вып. 12. – Ч. 1. – С. 33–42.
3. *Paruch, W.* Tradycja i nowoczesnosc. Pilsudczykowska mysl polityczna w Drugiej Rzeczypospolitej / W. Paruch // Biuletyn Instytutu Pamieci Narodowej. – 2008. – № 5 – 6. – S. 55–63.
4. Deklaracja ideowo-polityczna Obozu Zjednoczenia Narodowego. – Srodkowy Wschod, 1946. – 19 s.
5. *Wojdylo, W.* Wychowanie jako forma dzialania politycznego w mysli spoleczno-politycznej obozu narodowego w latach 1926–1939 / W. Wojdylo // Wychowania a polityka. Miedzy wychowaniem narodowym a panstwowym / pod. red. W. Wojdyly. – Torun: Wydawnictwo Uniwersytetu Mikolaja Kopernika, 1999. – S. 57–68.
6. *Jedruszczak, T.* Pilsudczycy bez Pilsudskiego. Powstanie Obozu Zjednoczenia Narodowego w 1937 roku / T. Jedruszczak. – Warszawa: PAW, 1963. – 230 s.
7. Slownik organizacji mlodziezowych w Polsce 1918–1970 / Cz. Kozlowski [i in.]; pod red. Cz. Kozlowskiego. – Warszawa: Iskry, 1971. – 191 s.
8. Zwiazek Mlodej Polski // Awangarda Panstwa Narodowego. – 1938. – № 7 – 8. – S. 295–298.
9. Poklosie ideologiczne I kursu sluzby mlodych // Awangarda Panstwa Narodowego. – 1938. – № 5 – 6. – S. 249–253.
10. Sluzba Mlodych i zagadnienie mlodego pokolenia // Awangarda Panstwa Narodowego. – 1938. – № 5 – 6. – S. 257–259.
11. *Milewski, A.* Dzialalnosc organizacyj mlodziezowych / A. Milewski // Polesie. – 1939. – № 9. – S. 8–9.
12. *Majecki, H.* Oboz sanacyjny na Bialostocczyznie w latach 1926–1939 / H. Majecki // Studia Podlaskie. – 1993. – T. IV. – S. 67–90.
13. *Kuczynski, Z.* Bomba pod Uniwersalem. Wspomnienia wilenskiego terrorysty / Z. Kuczynski // Glaukopis. – 2012. – № 25–26. – S. 18–42.
14. *Sheybal, S.* Sprawozdanie z dzialalnosci O. Z. N. na Polesiu / S. Sheybal // Polesie. – № 9. – S. 2–4.


### Summary


*The article is devoted to the ideological and organizational evolution «sanation» mode in the second half of the 1930s, its influence on the development of a pro-government youth movement in the interwar Polish state. We give a detailed description of the ideology of «sanation» Camp national association. The ideology, organizational structure and activities associated with the «sanation» group of youth organizations – the Union of Young Poland and Young Services are chracterized as well.*


Паступіў у рэдакцыю 31.01.2014 г.

Рэпазіторый БДПУ